*К. А. Сугак*
*УА МДПУ імя І. П. Шамякіна (г. Мазыр)*

# САТЫРА ЯК АДЗІН СА СРОДКАЎ МАСТАЦКАГА ВЫЯЎЛЕННЯ РЭЧАІСНАСЦІ Ў ПРОЗЕ Ю. СТАНКЕВІЧА

Творы Ю. Станкевіча вострыя па гучанні, па праблематыцы, па напружаных жыццѐвых сітуацыях, у якія трапляюць яго персанажы. Пісьменнік не імкнецца запалохаць чытачоў, узбуйніўшы карціны масавага алкагалізму, прастытуцыі, наркаманіі, а шляхам шокавай тэрапіі прымусіць чытача задумацца пра магчымыя вынікі абыякавага стаўлення да свайго жыцця і лѐсу сваіх дзяцей.

Адным з мастацкіх сродкаў, абраных пісьменнікам для паказу негатыўных з‘яў у жыцці грамадства, выступае сатыра, востры, выкрывальны смех у яго розных праявах.

―Сатыра (лац. satira – сатура, літаральна – сумесь, усякая ўсячына) – від камічнага, бязлітаснае, знішчальнае пераасэнсаванне аб‘екта адлюстравання (і крытыкі), якое вырашаецца з дапамогай смеху, адкрытага альбо прыхаванага; спецыфічны спосаб мастацкага ўзнаўлення рэчаіснасці, які раскрывае яе як нешта алагічнае, нязвыклае, унутрана неадпаведнае (змястоўны аспект) сродкамі смехавых, выкрывальных вобразаў (фармальны аспект)‖ [www: slovari.yandex.ru]. З аднаго боку, сатыра імкнецца да ўзнаўлення рэчаіснасці, да рэальнага раскрыцця недахопаў і супярэчлівасцей жыццѐвых з‘яў, але разам з тым моц пратэсту і абурэння ў ѐй настолькі вялікая, што яна перастварае гэтыя самыя з‘явы, парушае прапорцыі, высмейвае іх, малюе іх у гратэскавай, скажонай, пачварнай форме для таго, каб з асаблівай рэзкасцю падкрэсліць іх непрымальнасць.

МГПУ им. И.П.Шамякина

У рамане ―Любіць ноч – права пацукоў‖ Ю. Станкевіч паказвае, па сутнасці, такія праблемы сучаснага грамадства, як абыякавасць да ўласнага лѐсу, пасіўнасць у супрацьстаянні ―чужынцам‖.

Так, ужо на самым пачатку твора, разважаючы пра катастрафічнасць з'яўлення чужынцаў у іх мястэчку, Люба, адна з цэнтральных гераінь твора, адзначае, што прыхадні аселі на былым участку маѐра Фралова, ―бо той русак выйшаў у адстаўку і пасля вайны асеў у іх мясцінах, тут яму пабудавалі дом, ѐн недзе служыў, але неўзабаве кінуў, і ў яго доме пачалі піць, і не так, як пілі суседзі ці ўвогуле мясцовыя, – у доме Фраловых пілі ўсе: ѐн, яго жонка і дарослыя дзеці – дачка Феня і сын Клім‖ [1, с. 236]. Як бачым, аўтар паказвае паступовую дэградацыю мясцовага насельніцтва, распаўсюджанне якой як своеасаблівай інфекцыі, эпідэміі зыходзіць ад дома Фраловых, ад іх дэфіцыту імунітэту і супрацьстаяння ўсялякім негатыўным уплывам. Звычайна вайскоўцы лічыліся прадстаўнікамі грамадскай эліты, а тут бачым поўны і знешні, і духоўны распад: ―…Маѐр сядзеў штодня на лаўцы перад сваім домам, брывасты, з жабіным ротам, і па-дурному ўсміхаўся ці зрэдку пачынаў выкрыкваць нешта пагрозлівае так, маць вашу, так, уга-ха‖ [1, с. 236]. У знешнім абліччы маѐра Фралова гратэскава падкрэслены прыкметы выраджэння, страты чалавечага аблічча: жабіны рот, дурнота і г.д.

Нават выкарыстанне ненарматыўнай лексікі ў творы садзейнічае ўзмацненню сатырычнага эфекту.

Месца дзеяння ў рамане – Беларусь. Час – другая палова 90-х гадоў мінулага, ХХ-га, стагоддзя. Ю. Станкевіч па-майстэрску выкарыстоўвае магчымасці сатырычнага пісьма, шчодра ўжывае гратэск: ―…На некалькіх прыпынках стаялі паныла купкі людзей, швэндаліся бамжы, а ўбаку, ля крамак, дзяжурылі дзве маладыя прастытуткі, і адна з іх беспамылкова пазнала ў ім прыезджага і заўсміхалася, выставіўшы наперад далоні з растапыранымі пальцамі, што азначала, пэўна, лічбу…‖ [1, с. 253]. Але за падобнай канкрэтызацыяй месца і часу дзеяння адчуваецца вялікая аўтарская праекцыя ў прастору, жаданне аўтара паказаць, што падобная эпідэмія не мае межаў і можа распаўсюдзіцца па ўсім свеце, калі над ім будзе валадарыць абыякавасць.

Пагэтаму пісьменнік дэталѐва і падрабязна стварае цэлы шэраг сатырычных тыпаў, надзеленых выразнымі прыкметамі духоўна-маральнага падзення.

―Усім жыць трэба, усе хочуць есці, піць, анягож‖ [1, с. 311], – гаворыць сусед Любы, Іосіф Манюка, чыю дачку, і ѐн ведае пра гэта, згвалцілі юнакі-бежанцы.

Увогуле пры стварэнні вобраза гэтага чалавека Ю. Станкевіч не шкадуе сатырычных фарбаў. Неабходна адзначыць, што пісьменнік удала

МГПУ им. И.П.Шамякина

карыстаецца класічнай для беларускай літаратуры традыцыяй надання сатырычным тыпам гаворачых прозвішчаў. Так, прозвішча Манюка відавочна падкрэслівае самую істотную рысу ў яго натуры: вялікую здольнасць хлусіць усім і самому сабе, толькі б нішто не пашкодзіла яго матэрыяльнаму камфорту.

Нават сядзіба яго нагадвае сметнік, звалку нікому не патрэбных рэчаў: ―…Увесь двор і гарод яго былі заўсѐды завалены ржавымі трубамі, анучамі, сапсаванымі чыгуннымі радыятарамі, бочкамі ды розным іншым жалеззем‖ [1, с. 244].

Абыякавасцю да свайго ўласнага лѐсу і лѐсу саваѐй дачкі, імкненнем задаволіць у першую чаргу свае жаданні ―есці, піць і спажываць як мага болей‖ пазначана ўсѐ ў паводзінах, знешнасці і быце гэтага чалавека. Нават калі да яго з просьбай аб падтрымцы ў супрацьдзеянні пацукам прыйшла Люба, ѐн не перастае жаваць: ―…З‘явіўся і сам Іосіф Манюка; высунутыя яго сківіцы нешта жавалі‖; ―гаспадар цягнуўся следам, жаваў выцягнутымі наперад, як у малпы, сківіцамі і гнуў сваѐ

Усім жыць трэба, усе хочуць есці, піць, анягож‖ [1, с. 245]. Як бачым, і тут у знешнасці мясцовага прыстасаванца, канфарміста, што гатовы прадацца і прадаць сваю дачку, толькі каб яго не чапалі, падкрэсліваецца фізічнае і духоўнае выраджэнне.

Вось што ўбачыў Даніла Прусак, калі прыехаў у Янаўск: ―… У многіх кватэрах вокны былі выбітыя і закладзеныя фанерай, а то і заткнутыя рыззѐм, каналізацыйныя люкі зеўралі пустатой, там-сям іржавелі паваленыя агароджы, а каля харчовых крамаў тоўпіліся брудныя мужчыны і жанчыны з азызлымі азіяцкімі тварамі ў чырвоных пражылках – тварамі аматараў спіртнога і апушчэнцаў, і адтуль далятаю ўвесь час рэзкія крыклівыя істэрычныя воклічы махахудабатак і гэтак‖ [1, с. 256].

Нават прадстаўнікі ўлады, міліцыянеры, якія па абавязках павінны абараняць пакрыўджаных, наводзіць парадак, робяць выгляд, што ў гарадку нічога выключнага і страшнага не адбываецца. І тут пісьменнік карыстаецца сродкамі сатырычнага пісьма: ―…Тады яна звярнулася да ўчастковага, былога вяскоўца, зухаватага, маладога яшчэ, гадоў трыццаці, вузкага ў плячах і ўжо аб‘ѐмнага ў паясніцы чалавека, які дасягнуў межавай для сябе вышыні – падняўся да лейтэнанцкага звання, і той хадзіў разбірацца і на яе пытанні заўсѐды казаў тактак

нешта з паважным выглядам крэсліў у сябе ў блакноце асадкай, пукаціў чорныя, ухілістыя вочы і зноў казаў

тактак і яна ў думках ужо зняважліва звала яго Тактакам…‖ [1, с. 238–239].

МГПУ им. И.П.Шамякина

Відавочна, пасада добра корміць гэтага чалавека, працуе ѐн у той меры, каб не нашкодзіць сабе і застацца харошым для іншых. Але рашучых дзеянняў супраць чужынцаў ѐн прымаць не будзе. Гэта падкрэсліваецца ў творы тым, што лейтэнант пазбягае глядзець у вочы людзям.

Ён ужо даўно ―прадаўся‖ чужынцам, яны купілі яго маўчанне: ―…У яго ўжо з‘явілася іншамарка, ѐн увесь час некуды спяшаўся…‖ [1, с. 239].

І нават у душах станоўчых герояў Ю. Станкевіча – расчараванне і сумненні ва ўласных сілах. Прыкладам страты чалавекам упэўненасці і веры ў рамане ―Любіць ноч – права пацукоў‖ становіцца Антон Кніга, які прайшоў пекла сталінскіх лагероў і цяпер дапамагае Данілу. Ён кажа: ―У мяне ўражанне, што мы сапраўды мусім дарэмна затыкаць тую плаціну, якую ўжо прарвала, і ваду назад не вернеш, праўда, а варта, можа, толькі сябе ратаваць...‖ [1, с. 319].

Відавочна, што сатыра пісьменніка дапамагае зразумець магчымую страшную ступень падзення сучаснага грамадства.

Ступень духоўнага здароўя грамадства вымяраецца паводле яго стаўлення да дзяцей, а тым больш хворых дзяцей. Так, у творы ахвярай абыякавасці становіцца ―даўнѐнак‖, сын Любы, народжаны пасля Чарнобыля, маленькае безабароннае дзіцятка... Аўтар стварае свой уласны аказіяналізм дзеля абазначэння такой катэгорыі дзяцей – ―даўнѐнак‖ [1, с. 238]. Так падкрэсліваецца і звычайнасць, і масавасць нараджэння такіх дзяцей у постчарнобыльскім грамадстве. І ў гэтым пісьменніку бачыцца вялікая трагедыя беларускага народа. Псіхалагічна працінае эпізод з дзіцячымі рэчамі на пляжы (―Паглум‖): ―…Стрыжаны Сярожа раптам падышоў да таго месца, дзе сядзеў Даніла Прусак, і сказаў я вытруся

але мужчына не зразумеў, пра што тлумачыць голы Сярожа, і, сціснуўшы сківіцы, заўважыў ты б менш

крычаў, дзіцѐ напалохаеш

а той тым часам падчапіў з зямлі хлопчыкаву коўдру і ручнік і пачаў выцірацца імі…‖ [1, с. 266].

Увогуле, у творы практычна адсутнічаюць здаровыя людзі. Пры гэтым яны псіхічна ці фізічна хворыя ад нараджэння ці па прычыне жыццѐвых абставін (Волечка-Алеся, нямоглы Антон Кніга, наркаманы, жабракі, папрашайкі).

Усе гэтыя фактары памнажаюцца на выразную пазіцыю аўтара, яго востры душэўны боль, якім прасякнуты кожны радок рамана.

Нават шчаслівая развязка на карысць галоўнага героя не прыносіць доўгачаканай палѐгкі. Адсутнасць аптымізму аўтара пацвярджае і сімвалічная сцэна ўсходу сонца ў канцы твора, станоўчае і ачышчальнае

МГПУ им. И.П. Шамякина

значэнне якой зводзіцца да нуля апошнімі трыма словамі даўнѐнка, якія і заканчваюць раман: ― …Глядзеў бяздумна, як чырвоны дыск сонца ўздымаецца над даляглядам, высвечваючы друхлыя будынкі і кволыя, самотныя дрэвы і траву пад імі, і гаварыў мы грэбаныя псіхі‖ [1, с. 326].

У творы карціна выглядае падобнай да рэальнасці: забіта жанчына, невядома, што будзе з героем далей, такі здзек учынены з хворага хлопчыка і, як прызнаецца старэйшы з чужынцаў, ―яны экспансуюць сталіцу, туды ўжо і грошы адпраўлены – на подкуп, на хабар, і зямля там для іх гатовая, а вашых людзей, – даводзіў ѐн, – купіць вельмі лѐгка, ды ты і сам бачыш, хоць ты і вар'ят, хто праз дзесяць гадоў будзе тут пры ўладзе, хто будзе сапраўдны гаспадар, вы ж бездапаможныя, хцівыя і раз'яднаныя...‖ [1, с. 324].

Пісьменнік намагаецца здзейсніць справядлівасць, супрацьстаяць пасіўнасці суайчыннікаў і нахабству чужынцаў.

Але непарушанай застаецца галоўная прычына бедстваў карэннага насельніцтва ў дзяржаве, паказаная ў рамане. Гэтая прычына – катастрафічная раз‘яднанасць абарыгенаў. Усѐ, што робіцца супраць іх, у канчатковым выніку здзяйсняецца іхнімі ж рукамі. Сястру Данілы Прусака забівае пакаѐўка Васіліна, якая стала адданай прыслужніцай прыхадняў, іх волю яна з халопскай адданасцю і выканала. За свае злачынствы яна ўрэшце пакарана.

Фінал у творы жудасны: Даніла ―ўбачыў у лужыне крыві пакаѐўку чужынцаў – вены на яе звязаных руках былі перарэзаны, не інакш, твар і выскаленыя зубы запэцкаліся ў крыві, яна была яшчэ жывая і, убачыўшы Прусака, прахрыпела:

я забіла

і ўсѐ цягнулася да чужынцаў, прагнула быць з імі і прасіла забярыце

мяне, забярыце альбо дабіце

і мужчына здзівіўся ў душы гэтай халопскай адданасці і халопскай жорсткасці‖ [1, с. 324–325].

Настойліва падкрэсліваючы, што галоўная бяда – у раз‘яднанасці карэнных жыхароў, з-за якой яны застаюцца бяссільнымі супраць прыхадняў, аўтар мэтанакіравана сцвярджае думку пра неабходнасць нацыянальнага адзінства, якое і павінна стаць выратавальным для народа, калі ѐн хоча мець нармальную будучыню.

Творчасць Ю. Станкевіча садзейнічае ўзнікненню сітуацыі палемічнасці, спрэчак. Сакрэт яе і прыцягальнасць – у ідэйнай напоўненасці твораў, нягледзячы на ўсю іх грубасць і нахабны сарказм. Станкевіч абсалютна відавочна ваюе з навакольнай нечысцінѐй.

МГПУ им. И.П.Шамякина

У тэкстах Юры Станкевіча відавочна прысутнічае іронія, а гэта заўсѐды з‘яўляецца крытэрам таленавітасці. М. Южык зазначае: ―Іронія, якой нідзе не навучаць, ставарае поліфанічнасць гучання твораў, не дае ім зрабіцца плоскімі ў чытацкіх вачах. Смех скрозь слѐзы? Не, хутчэй – слѐзы скрозь смех якраз і прымушаюць іх з цікавасцю чытаць, з імі спрачацца, пра іх разважаць, не ўпадаючы ў маркоту‖ [2, с. 328].

Такім чынам, у рамане ―Любіць ноч – права пацукоў‖ пісьменнік асэнсоўвае праблему дэградацыі чалавека, імкнецца выявіць сутнасць прагрэсіравання пасіўнасці сучаснага грамадства. Абыякавасць, жывѐльныя інстынкты, маральна-духоўная пустата, прадажніцтва, хабарніцтва становяцца тымі негатыўнымі праявамі жыцця грамадства, з якімі змагаецца пісьменнік сродкамі мастацкага пісьма.

**Літаратура**


1. Станкевіч, Ю. Апладненне ѐлупа: раманы, аповесці, апавяданні / Ю. Станкевіч. – Мінск, 2005.
2. Южык, М. Слѐзы скрозь смех / М. Южык // Дзеяслоў. – 2008. – № 36. – С. 326–328.


МГПУ им. И.П.Шамякина